

Са стыхіяй на «ты»

СТАР. 3



Сем рэпетыцый… рабавання

СТАР. 5



Праграма тэлебачання на тыдзень

20 КАНАЛАЎ

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 ЛІСТАПАДА 2016 г. ПЯТНІЦА № 218 (28328)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# Маладыя гады, маладыя жаданні...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Сужэнцы Пётр і Таццяна СОЛАДАВЫ з Мінска выйшлі на прагулку з шасцімесячнай дачушкай. Пакуль Ганначка соладка спала на свежым паветры, маладыя людзі скарысталіся магчымасцю пагуляць у снежкі, як у дзяцінстве.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Алена ПЯРМІНАВА, дырэктар дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму:**

*«Мы ні ў якім разе не закрываем абмеркаванне праекта ўказа «Аб мерах па развіцці аграэкатурызму ў Рэспубліцы Беларусь». Несумненна, што дыялог будзе весціся. Неабходнасць змяненняў ва ўказ №372 наспела даўно, і пра гэта гавораць не толькі прадстаўнікі дзяржорганаў, але і ўладальнікі аграсядзіб. Асноўнае ў прэтэнзіях у тым, што па сутнасці некаторыя сядзібы працуюць па прынцыпе банкетных залаў і зацікаўлены ў першую чаргу ў правядзенні масавых мерапрыемстваў, а не ў развіцці турызму ў вёсцы».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.11.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9109 | ▲ |
| Еўра | 2,0885 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0301 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0747 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Насуперак стэрэатыпам

## У грамадстве або ў чатырох сценах?

### Ці стануць вучні з асаблівымі патрэбамі часткай вялікай школьнай сям'і

**Ці гатова беларускае грамадства да масавага ўкаранення інклюзіі ў сістэму агульнай адукацыі? Як змагацца з распаўсюджанымі стэрэатыпамі і забабонамі? З якімі праблемамі сутыкаюцца педагогі навучальных устаноў, уключаных у рэспубліканскі праект па інклюзіўнай адукацыі? Ці трэба цалкам адмаўляцца ад сістэмы спецыяльнай адукацыі? Адказы на ўсе гэтыя пытанні шукалі ўдзельнікі першай Міжнароднай канферэнцыі «Інклюзіўныя працэсы ў адукацыі», якая прайшла ў Мінску і сабрала больш як 300 спецыялістаў і прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый з Беларусі, Расіі, Польшчы, Украіны, Казахстана, Турцыі, Італіі і іншых краін.**

СТАР. 4



■ Па-чалавечы

## БЕЛЫ БІМ — НІЧЫЙНАЕ ВУХА

**Дождж ліў не спыняючыся. Пранізлівы вецер, здавалася, прабіраў да самых касцей, калі я выйшла з цягніка ў Стоўбцах. У такое надвор'е, як кажуць, добры гаспадар сабаку на вуліцу не выганіць. І вось нібы тая варона накаркала. У зале чакання чыгуначнай станцыі літаральна пад нагамі пасажыраў блытаецца шчанюк, худы, знясілены, ледзьве трымаецца на лапах. На шыі чырвоны раменьчык ад блох. Відаць, жыў дома або на дачы...**

Пасля заканчэння дачнага сезона пачынаецца вялікая міграцыя па ўсёй краіне. Людзі напрацаваліся, надыхаліся свежым паветрам, даелі апошнія шашлыкі і вяртаюцца ў горад лячыць радыкуліт, што зарабілі на градках. Пасля загрузкі ў легкавік сваіх дамачадцаў, у багажнік — мяхоў з бульбай, слоікаў з хатнімі нарыхтоўкамі, аказваецца, што месца для сабакі або ката ўжо не хапае. І кожны шукае для сябе апраўданне. У цешчы абвастрылася астма ад поўсці, ды і наогул гэты хвастаты не дае па начах нармальна спаць: вострыць кіпцюры аб новую мэблю.

Магчыма хтосьці з былых гаспадароў і пусціць слязу, якая высахне па меры набліжэння да горада. А затым усё забудзецца, як дрэнны сон, і жыццё ўвойдзе ў звыклую каляіну. Якім жа чэрствым, мякка кажучы, трэба быць, каб прыручыць жывёліну, а затым кінуць яе на немінучую гібель. І не варта суцяшаць сябе, што беспрытульнікі выжывуць і пракормяцца без дапамогі чалавека. Некаторы час былыя любімцы яшчэ будуць з надзеяй чакаць, што гаспадары вернуцца, забяруць з сабой. Але многія з іх тут застануцца тут назаўсёды. Тых, хто не загіне ад голаду, даканае холад. Кінутыя сабакі пачнуць збівацца ў небяспечныя для мясцовых жыхароў зграі. Па іх прыедуць людзі са стрэльбамі...

СТАР. 3

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!